Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 13 (636) Пятніца, 15 красавіка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 1 кап.

УСЯ НАША КРАІНА УРАЧЫСТА АДСВЯТКАВАЛА 12 КРАСАВІКА — ПЯЦІГОДДЗЕ ДНЯ КАСМАНАЎТЫКІ. КАМСАМОЛЬСКІЯ АКТЫВІСТЫ СТУДЭНЦКІХ ГРУП, КУРСАЎ УНІВЕРСІТЭТА АРГАНІЗАВАЛІ ПРАГЛЯД КІНАФІЛЬМАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫХ ДАСЯГНЕННЯМ СССР У ДАСЛЕДАВАННІ КАСМІЧНЫХ ПРАСТОРАЎ.

У ІНТЭРНАТАХ, НА КУРСАХ І ФАКУЛЬТЭТАХ АДБЫЛІСЯ ЦІКАВЫЯ ГУТАРКІ, СХОДЫ, ДЗЕ ІШЛА РАЗМОВА АБ ГЭТАЙ ВЫДАТНАЙ ПАДЗЕІ Ў ЖЫЦЦІ САВЕЦКАГА НАРОДА.

# У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ

## АБ РАБОЦЕ МАЛАДЫХ КАМУНІСТАЎ У ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

ПАРТЫЙНЫ камітэт універсітэта заслухаў на сваім пасяджэнні вынікі работы камісіі па праверцы работы маладых камуністаў з ліку студэнтаў у грамадскіх арганізацыях. Важнасць данага пытання вынікае з таго, што ва універсітэце арганізавана і працуе трыццаць дзве студэнцкія партыйныя групы. Яны праводзяць вялікую арганізацыйна-партыйную і выхаваўчую работу сярод беспартыйнай моладзі.

Як паказала праверка, у партыйных арганізацыях асобных факультэтаў накоплены некаторы станоўчы вопыт растаноўкі маладых камуністаў-студэнтаў на адказных участках грамадскай работы, кіраўніцтва іх дзейнасцю і аказання практычнай дапамогі.

Так, на гістарычным фафультэце работу маладых камуністаў у грамадскіх арганізацыях лічаць асноўным і адказным даручэннем, сочаць за ходам выканання гэтых даручэнняў, пастаянна аказваюць практычную дапамогу. Усе студэнты-камуністы (а іх каля 50 чалавек) працуюць на важнейшых грамадскіх пастах. Пяць камуністаў з'яўляюцца членамі камітэта камсамола, шэсць—члены прафбюро факультэта. Тры — Пратчанка, Калеснік, Гынілёўскі—выбраны ў склад прафкома універсітэта. Камітэт камсамола ўзначальвае камуніст Аркадзій Місуна. Сакратарамі камсамольскіх арганізацый курсаў з'яўляюцца камуністы Валерый Галубовіч і Фёдар Малюта. Растаноўка студэнтаў-камуністаў на важнейшых участках грамадскай работы, іх актыўная дзейнасць, аказваюць станоўчы ўплыў на вучэбна-выхаваўчы працэс. Студэнты гістфака займаюць адно з вядучых месц ва універсітэце па паспяховасці. Гонарам факультэта з'яўляецца выдатная вучоба камуністаў Траскунова, Пугаўкі, Калесніка, Бараноўскага, Клімовіча і іншых.

Станоўчы вопыт грамадскай работы накоплены і на філалагічным факультэце.

Але побач з гэтым было адзначана, што партыйныя арганізацыі асобных факультэтаў мала ўдзяляюць увагі справе растаноўкі маладых камуністаў з ліку студэнтаў на адказных участках грамадскай работы, не правяраюць ход выканання адказных партыйных даручэнняў. Так, не ўсе маладыя камуністы матэматычнага факультэта маюць пастаянныя даручэнні. Камуністы Крук, Кажэмякін, Цішко не прымаюць ніякага ўдзелу ў жыцці факультэта. Па-за партыйным кантролем знаходзіцца факультэцкая арганізацыя ДТСААФ. Па гэтых прычынах рэзультатыўнасць яе дзейнасці за апошні час рэзка знізілася.

Ёсць нямала недахопаў у рабоце з маладымі камуністамі ў партыйных арганізацыях фізічнага, хімічнага, геаграфічнага і іншых факультэтаў.

Па-сутнасці, па-за кантролем партыйнай арганізацыі знаходзіцца работа камуністаў, выбраных у камітэт камсамола, прафком і іншыя грамадскія арганізацыі. Партыйныя арганізацыі не ведаюць таго, што асобныя камуністы, як, напрыклад, т. Сучкоў, безадказна адносяцца да абавязкаў члена камітэта камсамола.

Лічачы прыцягненне камуністаў з ліку студэнтаў да актыўнай грамадскай работы, важнейшай формай іх выхавання як важакоў мас, партыйны камітэт абавязаў партбюро матэматычнага, фізічнага і хімічнага факультэтаў пераглядзець растаноўку маладых камуністаў на важнейшых участках грамадскай работы, умацаваць грамадскія арганізацыі найбольш актыўнымі, валодаючымі дзелавымі якасцямі, камуністамі.

Адначасова партком лічыць неабходным, каб бюро партыйных арганізацый факультэтаў сістэматычна заслухоўвалі справаздачы, на сваіх пасяджэннях маладых камуністаў аб іх грамадскай рабоце, павысілі да іх патрабавальнасць, а галоўнае—ўзмацнілі аказанне ўсебаковай дапамогі.

Партыйны камітэт даручыў сакратару парткома універсітэта Т. Я. Дударавай правесці ў бліжэйшы час інструктыўную нараду з маладымі актывістамі, заслухаць іх заўвагі, прапановы, пажаданні з мэтай вызначэння задач па аказанню ім канкрэтнай дапамогі.



Юнакі, якіх вы бачыце на гэтым здымку — студэнты першага курса фізфака. Рознымі шляхамі прыйшлі яны ва універсітэт. За плячыма ў Івана Клапоцкага (злева)—вучоба ў аўтадарожным тэхнікуме, цаліна, будаўніцтва чыгункі «Дружба», служба ў радах Савецкай Арміі. Цяпер кандыдат у члены КПСС Іван Клапоцкі — староста групы і актывіст факультэта. Віталій Карабейнікаў — мінулагодні выпускнік сярэдняй школы. Ва універсітэце іх аб'ядноўвае адзінае жаданне — глыбока авалодаць ведамі, стаць кваліфікаванымі спецыялістамі.

Фота С. Супруна.

# СТАРТ— ЗАЎТРА

## КРОКІ ЛЕНІНСКАЙ ЭСТАФЕТЫ

Камсамолія універсітэта багата сваімі слаўнымі традыцыямі. Характэрна, што іх становіцца ўсё больш больш. Штогод восенню вясной у нас праводзяцца традыцыйныя кросы. Сёлета такі крос арганізуецца ў гонар 96-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Няхай ён, як заўсёды, будзе масавым, стане сведкай на шай высокай згуртаванасці прыкладам жадання памнажаць традыцыі камсамоліі. Недалёка той час, калі выпускнікі паедуць працаваць на вытворчасць. Першакурсніку трэба ўзяць гэтую слаўную традыцыю ад сваіх старэйшых таварышаў, як эстафету, і з гонарам пранесці яе праз усе гады вучобы ва універсітэце, каб пасля зноў перадаць сваім малодшым сябрам.

Усе — на старт, таварышы!

Н. КАЗЛОВЕЦ.

## ГАРЫЦЬ «ВЯСНОВЫ АГАНЁК»

*На падрыхтоўчым факультэце адбылася сустрэча сакратара ЦК ЛКСМ Беларусі Рымы Сяргееўны Піонавай са студэнтамі з Кубы і краін Афрыкі. Яна расказала замежным сябрам аб актыўным удзеле камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат рэспублікі ў будаўніцтве камунізма.*

*У студэнцкім інтэрнаце № 2 было арганізавана кафэ «Вясновы аганёк». Савецкія і замежныя студэнты фізічнага, хімічнага, біялагічнага і матэматычнага факультэтаў запалілі «Вясновы аганёк».*

# З 25 КРАСАВІКА ПА 5 МАЯ АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ

Для агляду будуць прадстаўлены газеты грамадскіх арганізацый факультэтаў, навукова-студэнцкіх таварыстваў, а таксама газеты студэнцкіх інтэрнатаў. Агляд будзе праводзіцца з 25 красавіка па 5 мая.

Партком зацвердзіў наступны склад журы па агляду насценнага друку універсітэта:

Ткачоў П. І — старшыня журы;

Гахаў Ф. Д. — член парткома;

Чартко М. К. — член парткома;

Фігloўская Л. І. — член мясцкома;

Ціва М. — намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

Карабіцкі Г. М. — член прафкома;

Дубовік В. І. — старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку;

Куцэнка М. Я. — выкладчык кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку;

Калечыц В. А. — старшыня СНТ.

# ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ, ГАСЦІННЫ ГОРАД

Адэса не парадавала нас добрым надвор'ем, але цяпло і гасціннасць, якую праявілі арганізатары XXII навуковай студэнцкай канферэнцыі універсітэта імя І. І. Мечнікава, зрабіла наша прабыванне там прыемным і незабыўным.

Дарэчы, трэба адзначыць, што дэлегацыя ад нашага універсітэта была самай вялікай. Тры даклады прачыталі студэнты матэматычнага факультэта А. Макаранка, М. Зарэцкі, Н. Ладзіс і два даклады студэнты геаграфічнага — І. Лазнуха, А. Мельнікаў, В. Вечар.

Студэнцкая навуковая канферэнцыя прайшла арганізавана, на высокім навуковым узроўні. Як ужо увайшло ў традыцыю, на пленарным пасяджэнні яе адкрыў рэктар універсітэта. Тут жа прысутнічалі дэканы ўсіх факультэтаў, госці, студэнты. Акрамя праграмы, вялікую цікавасць у гасцей выклікаў сістэматычны ўказальнік да «Зборніка студэнцкіх навуковых прац Адэскага дзяржаўнага універсітэта». Рэгулярнае выданне навуковых прац студэнтаў, безумоўна, станоўча адбіваецца і на цікавасці студэнтаў да самастойных даследаванняў і на усёй пастаноўцы вучэбнай і навуковай работы факультэтаў. Універсітэт мае сваю ўласную друкарню і два ратапрынты.

Два дні праходзілі пасяджэнні па секцыях. Як даклады гасцей, так і гаспадароў выклікалі вялікую цікавасць у прысутных, бо асновааны яны былі на канкрэтных даследаваннях. Так, на секцыі геолага-геаграфічных навук было прачытана за два дні 14 дакладаў і толькі два з іх былі з ліку літаратурнай тэматыкі. Цёпла былі сустрэты прысутнымі і даклады нашых студэнтаў геафака І. Лазнухі на тэму: «Фізіка-геаграфічныя ўмовы і глебы саўгаса Круцішынскі Алтайскага краю» і М. А. Мельніка і В. Вечара на тэму: «Некаторыя асаблівасці донных адкладанняў азёр Ушачскай групы».

У Адэскім універсітэце праводзілася вялікая работа па прымяненню матэматычных метадаў у геаграфічных даследаваннях. Тут студэнты эканамічна - геаграфічнага аддзялення слухаюць вышэйшую матэматыку на працягу пяці год. На першым курсе — агульны раздзел; на другім — «Размова з машынай»; на трэцім — «Матэматычная статыстыка»; на чацвертым — «Семінар па геаграфіі гарадоў»; на пятым — «Матэматычны метад у геаграфіі». Такая пастаноўка вучэбных дысцыплін не робіць матэматыку «лішняй» для географа. Наадварот, семінар, які я наведаў прайшоў вельмі актыўна і паказаў глыбокія веды студэнтаў. Заслуга у гэтым, вядома, выкладчыка Б. Л. Гурэвіча, які добра ведае і матэматыку і геаграфію. Таму з асаблівай увагай праслухалі мы даклад студэнткі IV курса Л. Камінскай на тэму: «Градаутвараючыя і градаабслугоўваючыя функцыі курортаў Вялікай Ялты».

Змястоўныя даклады зрабілі на канферэнцыі і матэматыкі.

Тэмы іх дакладаў актыўна абмяркоўваліся прысутнымі і атрымалі станоўчую адзнаку.

Для гасцей былі арганізаваны дзве экскурсіі: адна па гораду, другая—па Чорнаму мору. Акрамя гэтага быў культпаход у оперны тэатр і палеанталагічны музей.

Закрылася навуковая студэнцкая канферэнцыя прыёмам у рэктара, дзе гасцям былі ўручаны падарункі і граматы.

Мы пакідалі Адэсу, напоўненую водырам аблітых белай квеценню абрыкосаў. Кожны з нас кідаў у Чорнае мора манету і гаварыў: «Да новых сустрэч, гасцінны горад!».

П. КРЫВЕНЬКІ.

